Прызванне будаваць і абараняць

СТАР. 3

«SOS» з Падгорнай

СТАР. 4

Бегам — ад хвароб

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЖНІЎНЯ 2016 г. СЕРАДА № 152 (28262)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ХТО БУДЗЕ СЕЯЦЬ РАЗУМНАЕ, ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ?

Калі ў нашых настаўнікаў не будзе годнага статусу і зарплаты, дзяржава страціць лепшыя педагагічныя кадры

Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, заслухоўваючы даклад аб ходзе прыёмнай кампаніі і падрыхтоўцы сістэмы адукацыі да новага 2016/2017 навучальнага года.

«Пытанне статусу педагагічнага работніка, скажу дакладней — настаўніка, перш за ўсё сярэдняй школы, ужо набыло не проста грамадскае гучанне, а палітычнае. З многіх прычын. На настаўніку заўсёды ляжала цяжкая місія, і ніколі багатымі настаўнікі не былі. Не вельмі багатыя яны і сёння. Але нагрузку на іх, у тым ліку палітычную, мы накладваем велізарную, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вазьміце парламенцкія выбары, нядаўнія прэзідэнцкія выбары: хто складаў аснову палітычнага ядра, якое праводзіла галоўную палітычную кампанію? Настаўнікі, урачы, дзяржаўныя служачыя. І сёння гэтыя катэгорыі грамадзян, якія забяспечваюць стабільнасць у нашай дзяржаве, неабгрунтавана, напэўна, пакрыўджаныя. Але, перш за ўсё, настаўнік».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што далёкі ад папулізму — «проста павысіць зарплату настаўнікам — і кропка». «Я не хачу так ставіць пытанне. Я хачу сказаць па-іншаму: сітуацыя з матэрыяльным забеспячэннем настаўніцтва далей нецярпімая, таму давайце настаўніка нагрузім настолькі, наколькі ён павінен быць загружаны, але будзем плаціць належную зарплату. Мы настаўнікаў не страцім: настаўнікі былі і заўсёды будуць. Але мы вымываем самыя моцныя кадры з сістэмы нашай адукацыі, перш за ўсё са школы. Мы губляем самых лепшых настаўнікаў», — дадаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт рэзюмаваў, што статус настаўніка трэба падымаць. «Перш за ўсё ён залежыць ад самога настаўніка. Таму давайце загружаць настаўніка такім чынам, каб сапраўды яго статус быў высокі. Каб і ў вёсцы, і ў горадзе, асабліва ў вёсцы, настаўнік быў галоўнай дзеючай асобай, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — З іншага боку, і дзяржава павінна падставіць сваё плячо. Гэта дрэнна, калі ўжо сёння настаўнік у добрых, сярэдніх гаспадарках мае палову зарплаты ад заробку механізатара, даяркі. Гэта ненармальна. Таму гэтае пытанне карэннае, цэнтральнае. Як бы мы ад яго ні сыходзілі, як бы мы сябе ні закалыхвалі, што настаўнікі не ставяць перад намі нейкіх матэрыяльных пытанняў, мы дакладна павінны разумець, што для кожнага чалавека гэта важны момант. А для настаўнікаў архіважны, паколькі іх сярэдняя заработная плата ніжэйшая, чым па краіне».

Яшчэ адным важным пытаннем у сістэме адукацыі, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, з'яўляецца падрыхтоўка вучняў да школы. «Заўтра дзеці пойдуць у школу. Маё патрабаванне адно, яно зыходзіць ад грамадства: усе дзеці павінны быць у роўных умовах і павінны пайсці ў школу «аднолькава». Яны павінны быць апранутыя, як усе. Ёсць бяднейшыя пласты насельніцтва, ёсць сярэднія, багатыя і гэтак далей, але дзеці ў гэтым не вінаватыя. Яны павінны быць апранутыя і падрыхтаваныя: партфелі, заплечнікі і іншае, што неабходна, ад пластыліну і алоўкаў да адзення, — усё павінна быць аднолькава. Дзе браць грошы, я ўжо дзесяць разоў пра гэта казаў у папярэднія гады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў, што рэформы ў беларускай сістэме адукацыі не патрэбныя. «Хопіць гэтых рэформаў у адукацыі — трэба ўдасканальваць тое, што ёсць. Трэба даць нармальныя падручнікі, перш за ўсё падручнікі гісторыі ў школы, каб дзеці разумелі, што адбывалася ўчора ў нашай краіне. Погляд у мінулае — гэта погляд у будучыню. Не мне вас вучыць. А мы пачынаем займацца не тымі пытаннямі, якія сёння надзённыя для нашай сістэмы адукацыі», — адзначыў беларускі лідар.

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна акуратна ставіцца да Балонскага працэсу. Неабдуманыя рашэнні ў гэтым кірунку проста разбураць старую, нармальную сістэму адукацыі, а на яе месцы нічога не з'явіцца. «Нас ужо заходнікі папярэджваюць: вы адзіныя ў былым сацыялістычным лагеры, не кажучы пра Савецкі Саюз, засталіся, хто не разбурыў сістэму адукацыі, і яна дае вам эфект, не паламайце яе. Асабліва нас папярэджваюць нашы заходнія суседзі — усходнееўрапейскія дзяржавы, якія мелі падобную сістэму адукацыі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту далажылі аб развіцці профільнага навучання ў школах, падрыхтоўцы новых падручнікаў, закрыцці ўстаноў сярэдняй адукацыі і выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з тым, што закрыцця асобных школ не пазбегнуць, аднак падыходзіць да такіх рашэнняў варта ўважана, пралічваючы кожны крок. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў праверыць, якім чынам распрацоўваюцца заданні да ЦТ: магчыма, гэты кірунак неабходна ўдасканаліць.

На нарадзе было адзначана, што падрабязныя справаздачы аб тым, як скончыўся набор абітурыентаў у ВНУ і як школы гатовы да новага навучальнага года, будуць абмеркаваны ў бліжэйшы час на асобнай нарадзе. На ёй прымуць рашэнне па праблемах, якія сёння існуюць у сістэме адукацыі: ад школы да паслядыпломнай адукацыі. «Сёння задача адна — мы павінны пазначыць гэтыя праблемы і да нарады падрыхтаваць рашэнне або прыняць рашэнне па гэтых праблемах. Вось гэта мяне больш за ўсё хвалюе», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Бог Агню з прыстаўкай «Арт»

У Бабруйскім раёне пачаў работу міжнародны пленэр мастакоў-керамістаў «Арт-Жыжаль-2016», які сабраў некалькі дзясяткаў удзельнікаў з сямі краін. Арганізатарам і нязменным кіраўніком пленэру на працягу 14 гадоў з'яўляецца вядомы бабруйскі мастак-кераміст Валерый Калтыгін. На працягу дваццаці дзён майстры на базе адпачынку ААТ «ФанДОК» будуць тварыць, абменьвацца вопытам, праводзіць майстар-класы і творчыя лабараторыі, а пасля завяршэння пленэру будуць арганізаваны выставы работ у музеях Бабруйска і Магілёва.

На здымку: удзельнік пленэру «Арт-Жыжаль-2016» Антон ЦІХАНАВЕЦ з Магілёва.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, міністр адукацыі:

«Да новага года актыўна вядзецца капітальны рамонт устаноў адукацыі. Сёлета ўведзены тры новыя дашкольныя ўстановы, да канца года намечана ўвесці дзесяць дашкольных устаноў. Таксама адчыняць дзверы дзве школы. За 2015 год чарга ў дашкольныя ўстановы паменшылася ў два разы. Калі ў 2014 годзе ў ёй было больш за 14 тысяч дзяцей, то летась — каля 7 тысяч. Сістэма адукацыі да новага навучальнага года гатовая і фінансуецца ў рамках выдзеленых сродкаў у поўным аб'ёме. Такія артыкулы, як заработная плата, стыпендыі, выплачваюцца ў поўным аб'ёме».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.08.2016 г.

Долар ЗША	1,9658	▼
Еўра	2,1769	▼
Рас. руб.	0,0303	▲
Укр. грыўня	0,0792	■

■ Ва ўрадзе

Эканамічны рост аднаўляецца

Паводле слоў прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА дынаміка эканамічнага росту ў краіне аднаўляецца, прычым на неэмісійнай аснове. Але разам з тым кіраўнік урада выказаў незадаволенасць тым, як спрацавала эканоміка Беларусі з пачатку года. Таксама падчас пашыранага пасяджэння Савета Міністраў, дзе разглядаліся вынікі работы эканомікі ў першым паўгоддзі і дадатковыя меры па выкананні пастаўленых задач на 2016 год, ён адзначыў, што рэальны сектар у цэлым працуе ў збалансаваным рэжыме, а сацыяльныя гарантыі насельніцтву выконваюцца.

Валютны рынак пад кантролем

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у параўнанні са студзенем 2016 года індэкс ВУП павялічыўся на 1,9% і склаў па выніках паўгоддзя 97,5%. Пры гэтым Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што аднаўленчыя тэндэнцыі выяўляюцца ў большасці галін. Так, індэкс прамысловай вытворчасці павялічыўся на 5,2% і па выніках паўгоддзя склаў 98,4%. Сельская гаспадарка са 100,9% «вырасла» да 103,3%. Значна дадала транспартная галіна, дзе грузаабарот без уліку трубаправоднага транспарту вырас з 90% на пачатак года да 100,9% за паўгоддзе. Вырасла і прадукцыйнасць працы — з 97,3% да 99%.

У першым паўгоддзі Беларусь у поўным аб'ёме выконвала свае валютныя абавязацельствы без зніжэння ўзроўню золатавалютных рэзерваў. За сем месяцаў аб'ём ЗВР павялічыўся на 0,5 млрд долараў і на 1 жніўня склаў 4,6 млрд. На валютным рынку назіраецца станоўчы баланс попыту і прапановы валюты. За справаздачны перыяд насельніцтвам прададзена на чыстай аснове больш за 630 млн долараў. «Гэтаму спрыяе свабоднае курсаўтварэнне, якое дазволіла нам ісці за змяненнем курсу валюты нашага асноўнага гандлёвага партнёра — Расіі. Паслабленне беларускага рубля да долара склала 8%, у асноўным у пачатку года на фоне неспрыяльнай знешняй сітуацыі. Расійскі рубель знаходзіцца ў межах планаваных сярэднегадавых значэнняў на 2016 год — 297 недэнамінаваных рублёў», — растлумачыў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, такая палітыка дазваляе айчынным прадпрыемствам больш упэўнена адчуваць сябе на расійскім рынку.

СТАР. 2

Друкарскі станок спыніўся

■ Трэба разабрацца

ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА ПАД МІКРАСКОПАМ

Наколькі абгрунтаваныя заўвагі расійскага боку да айчынных прадуктаў харчавання?

Чатыры месяцы рэалізацыі Беларуска-расійскай праграмы маніторынгу якасці і бяспекі харчовых прадуктаў выяўляюць шматлікія факты несумленных, неаб'ектыўных прэтэнзій. Але расслабляцца беларускім вытворцам нельга.

ШТО НЕ ТАК?

Новую ініцыятыву распачало і плануе працягваць цягам бліжэйшых дзесяці гадоў Еўразійскае агенцтва міжнароднага супрацоўніцтва. Паводле слоў **генеральнага дырэктара агенцтва Аляксандра АЛЬШЭЎСКАГА,** прычынай стварэння праграмы маніторынгу якасці паслужыла вялікая колькасць пытанняў з боку кантралюючых органаў Расійскай Федэрацыі да прадуктаў беларускай вытворчасці. Прэтэнзіі былі да якасці, прысутнасці антыбіётыкаў і г.д., што прывяло да масавага спынення паставак на тэрыторыю краіны-суседкі. Цягам мінулага года частка гэтых прэтэнзій ацэньвалася экспертамі і самімі вытворцамі як праява несумленнай канкурэнцыі, як вынік некарэктных даследаванняў, аднак, відавочна, патрэбны больш грунтоўны падыход. Таму і нарадзілася на пачатку гэтага года праграма маніторынгу з трыма кірункамі работы.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІД узяла адказнасць за тэракт у Пакістане

Адказнасць за тэракт, здзейснены ў будынку бальніцы правінцыі Белуджыстан пакістанскага горада Квета, узяла на сябе ячэйка тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава», паведамляюць інфармагенцтвы. Нагадаем, магутны выбух прагрымеў у момант, калі ў бальніцы праходзіла акцыя памяці па забітым Білалу Анвару Касі — прэзідэнту Асацыяцыі адвакатаў Белуджыстана. Вядома, што бомбу прывёў у дзеянне смяротнік. Загінулі, па апошніх звестках, 93 чалавекі, яшчэ 120 атрымалі раненні.

Уплывовыя рэспубліканцы выступілі супраць Трампа

У ЗША 50 самых высокапастаўленых рэспубліканскіх функцыянераў, якія маюць дачыненне да нацыянальнай бяспекі, падпісалі ліст, заявіўшы, што кандыдат у прэзідэнты ад іх партыі мільярдэр Дональд Трамп не валодае неабходнымі для гэтай пасады характарам і досведам. На іх думку, ён ставіць пад пагрозу бяспеку і дабрабыт краіны. Сярод найбольш вядомых падпісантаў — былы дырэктар ЦРУ і АНБ Майкл Хайдэн, былыя намеснікі дзяржсакратара Джон Неграпонтэ і Роберт Зелік, два былыя сакратары па пытаннях нацыянальнай бяспекі Том Рыдж і Майкл Чартофф, былы дарадца па нацыянальнай бяспецы віцэ-прэзідэнта Дзіка Чэйні ў папярэдняй адміністрацыі Эрык Эдэльман і іншыя.

Ва Украіне задумаліся аб адмене стыпендый

Міністэрства адукацыі і навукі Украіны атрымала ліст ад міністэрства фінансаў, у якім з наступнага года прапануецца адмяніць стыпендыі для студэнтаў, а таксама бюджэтныя месцы ў магістратуры. Пра гэта ўкраінскаму выданню «Весткі» ў аўторак паведаміў намеснік кіраўніка камітэта Вярхоўнай Рады па пытаннях адукацыі і навукі Аляксандр Співакоўскі. Згодна з апублікаванай інфармацыяй, стыпендыі працягнуць атрымліваць толькі студэнты, якія маюць «рэальныя дасягненні», напрыклад навуковыя работы, а таксама тыя, хто аформіць статус матэрыяльна неабароненых. Для адмены стыпендый трэба ўнесці змены ў закон аб вышэйшай адукацыі Украіны, гэта значыць рашэнне павінна ўхваліць Вярхоўная Рада. Пры гэтым супраць адмены стыпендый выказаўся віцэ-прэм'ер Павел Разэнка. «Я думаю, што ўрад за гэта не прагаласуе», — сказаў ён.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Яйкі і чырвонае мяса павялічваюць рызыку заўчаснай смерці?

Рэгулярнае спажыванне бялкоў жывёльнага паходжання, якія ўтрымліваюцца, напрыклад, у чырвоным мясе і яйках, небяспечна для людзей, якія вядуць няправільны лад жыцця, якія пакутуюць ад атлусцення або маюць недастатковую вагу. З-за гэтага яны рызыкуюць памерці раней часу, перадае The Times Індыі. Спецыялісты з Масачусецкага шпіталя прааналізавалі даныя 170 000 чалавек. За час даследавання больш за 36 000 добраахвотнікаў памерла. Амаль 9000 удзельнікаў памерла ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, каля 13 000 — ад раку, прыкладна 14 000 — з іншых прычын. Навукоўцы выявілі, што частае спажыванне хлеба, злакаў, макаронных вырабаў, бабовых і арэхаў (крыніц раслінна-га бялку) абараняла ад заўчаснай смерці. А вось любыя віды мяса, яйкі і малочныя прадукты павялічвалі яе рызыку. Акрамя таго, павышэнне ўзроўню смяротнасці адзначалася сярод асоб, якія злоўжывалі алкаголем, курылі, і тых, хто вёў маларухомы лад жыцця. Пры здаровым ладзе жыцця сувязь паміж спажываннем жывёльных бялкоў і заўчаснай смерцю знікала.

КОРАТКА

Ордэнам Маці за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей узнагароджаны 17 шматдзетных жанчын Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў 8 жніўня.

Інфляцыя ў ліпені ў Беларусі склала 0,4%.

Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця разлічвае зацвердзіць восенню краінавую стратэгію для Беларусі.

Радыкальных змен падатковага заканадаўства на 2017 год не прадбачыцца. Аб гэтым заявіў міністр па падатках і зборах Сяргей Налівайка.

Кітайскія турысты ў складзе груп могуць наведваць Беларусь без віз з верасня 2016 года. Пратакол да пагаднення паміж урадамі Беларусі і Кітайскай Народнай Рэспублікі аб узаемных бязвізавых групавых турысцкіх паездках уступіў у сілу з 5 жніўня.

■ Збіраем ранец

АД 150 ДА 850 РУБЛЁЎ

Столькі каштуе сёлета сабраць дзіця ў школу

Падрыхтоўка да навучальнага года — асобны артыкул у сямейным бюджэце. Па падліках Мінгандлю, аптымальная экіпіроўка вучня малодшага ўзросту абыдзецца бацькам у 150—690 рублёў (з іх на адзенне і абутак — 100—400 рублёў). Каб сабраць на заняткі старшакласніка, спатрэбіцца ад 200 да 850 рублёў (140—500 з якіх пойдуць непасрэдна на форму). Затраты на камплекты для хлопчыка і для дзяўчынкі будуць прыкладна аднолькавымі.

СТАР. 3

Фота Надзеі БУЖАН.